УДК 378.1 (476)

*В.Л.ЦЫБОЎСКІ*

# ПРАБЛЕМА ПРЫНЦЫПАЎ ПАБУДОВЫ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Сучасны стан развіцця грамадства і разнастайных бакоў яго дзейнасці характэрызуецца тым, што адукацыя становіцца неабходнай умовай эфектыўнага існавання грамадства. Асобую значнасць набывае педагагічная адукацыя ў розных галінах жыцця і для ўсіх слаёў насельніцтва.

У сувязі з гэтым прынцыпы пабудовы нацыянальнай сістэмы педагагічнай адукацыі павінны прадугледжваць магчымасць дынамічнага рэагавання на запатрабаванні часу і тыя змены, якія адбываюцца ў эканамічным і сацыяльным жыцці. Разглядаючы з гэтага падыходу ролю педагагічнай адукацыі, неабходна адзначыць, што яна набывае новыя рысы, такія як усеагульнасць, мабільнасць, бесперапыннасць, сацыяльную запатрабаванасць, практычную накіраванасць і выніковасць. Менавіта спалучэнне гэтых асабістасцяў вызначае пазіцыю педагагічнай адукацыі ў сённяшнім грамадстве.

Усё больш становіцца зразумелым, што ўзровень урбанізацыі насельніцтва, які склаўся ў цывілізаваных краінах, і ў Беларусі таксама абмяжоўвае магчымасці асобы карыстацца і прысвойваць нормы, правілы і традыцыі народнай педагогікі, і яна паступова страчвае свае пазіцыі крыніцы педагагічных ведаў і педагагічнай самасвядомасці чалавека.

Істотным з'яўляецца і той факт, што значнае зніжэнне педагагічнай адукаванасці насельніцтва, якое адбылося ў апошняе дзесяцігоддзе, вядзе ў сваю чаргу да негатыўных з'яў у адукацыі і выхаванні падрастаючых пакаленняў, адмоўна адбіваецца на іх здольнасцях фарміраваць сістэму каштоўнасных арыенціраў і прыстасоўвацца на іх аснове да рэальнага жыцця, займаць у ім актыўную пазіцыю.

На прыканцы XX стагоддзя як ніколі ўзрастае роля настаўніка і агульнай педагагічнай адукацыі, а вынікі педагагічнай працы пачынаюць аказваць непасрэдны ўплыў на развіццё не толькі асобных кампанентаў сацыяльнай сістэмы, але і нацыі ў цэлым.

Таму ўяўляецца мэтазгодным разгледзіць некаторыя праблемы падрыхтоўкі будучага настаўніка ў святле пашырэння яго функцыі ў грамадстве. Менавіта ад своечасовага і правільнага вырашэння пытання аб адпаведнасці зместа педагагічнай падрыхтоўкі настаўніка, яго ролі ў грамадстве залежыць эфектыўнасць выканання настаўнікам сваіх функцый, а значыць, і вынікі адукацыі і выхавання.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Неабходна адзначыць, што традыцыйная педагагічная парадыгма, стрыжань якой – перадача ведаў і іх рэпрадукцыя пры калектыўных формах навучання, на мяжы 80–90-х гадоў стала паскорана разбурацца пад уздзеяннем не столькі крытыкі, колькі аб'ектыўных умоў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Але разбурэнне старой сістэмы не супала з узнікненнем новай, бо відавочна, што гэта працэс не аднаго дзесяцігоддзя. Рэальная педагагічная практыка паказвае прыклад марудных змен у адукацыі, якія часцей за ўсё звязаны з фармальна-структурным бокам навучання. Напрыклад, узнікненне новых назваў навучальных устаноў: гімназія, ліцэй, каледж, акадэмія, універсітэт. Безумоўна, гэта першыя крокі, яны маюць пазітыўны характар, але іх недастаткова, каб змяніць якасць адукацыі ў цэлым і педагагічнай адукацыі ў прыватнасці.

Удасканаленне навучальна-выхаваўчага працэсу ў вышэйшых навучальных установах праводзіцца па шэрагу напрамкаў: пашырэнне падрыхтоўкі настаўніка да выхаваўчай работы; паглыбленне метадычнай падрыхтоўкі ў залежнасці ад спецыяльнасці і спецыялізацыі; вывучэнне перадавога педагагічнага вопыту; павелічэнне ўзроўню акадэмічных ведаў і іншыя. Кожны з названых шляхоў, безумоўна, заслугоўвае сур'ёзнай увагі, але малаверагодна, што кожны з іх паасобку мог бы прывесці да вырашэння ўзнікшых перад педагагічнай тэорыяй і практыкай супярэчнасцяў падрыхтоўкі настаўнікаў, асноўнымі з якіх з'яўляюцца наступныя: несапалучэнне новай сацыяльнай і педагагічнай парадыгмы з існуючай педагагічнай практыкай і тэорыяй падрыхтоўкі настаўнікаў; адсутнасць самасвядомасці насельніцтва ў адносінах да педагагічнай адукацыі; недастатковы ўзровень распрацоўкі зместу педагагічнай адукацыі; метадалагічная неабгрунтаванасць сістэмы прынцыпаў пабудовы агульнапедагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў з улікам новага сацыяльнага заказу; адсутнасць тэарэтычнага забеспячэння ідэі паступовай усеагульнай педагагічнай адукацыі насельніцтва.

Найбольшую заклапочанасць выклікае праблема арганізацыі зместу педагагічнай адукацыі на розных узроўнях нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Традыцыйна метадалагічныя падыходы да фарміравання сістэмы прынцыпаў пабудовы зместу і структуры педагагічнай адукацыі ўлічваюць такія прынцыпы, як цэласнасць, сістэмнасць, пераемнасць, паслядоўнасць, навуковасць, сістэматычнасць і інш. Аднак не ўлічваюцца патрабаванні, звязаныя з канцэптуальна новым позіркам на педагагічную адукацыю, у якім пашыраецца роля сацыяльнай запатрабаванасці, адпаведнасці інтарэсам не толькі грамадства, але ў роўнай меры і асобы, практычнай значнасці і выніковасці педагагічнай тэорыі і практыкі. Невыкарыстоўванне вышэй названых прынцыпаў абмяжоўвае магчымасці ў распрацоўцы сістэмы зместу педагагічнай адукацыі, не спрыяе яе мабільнаму развіццю з улікам рэальных патрабаванняў практыкі сярэдняй і вышэйшай школы.

Узнікае неабходнасць удасканалення наменклатуры прынцыпаў распрацоўкі цэласнай сістэмы педагагічнай падрыхтоўкі сучаснага настаўніка, што, безумоўна, павінна прывесці да аптымізацыі спалучэння шырокага спектра элементаў, якія ўваходзяць у яе склад.

Актуальнасць такога падыхода абумоўлена патрабаваннем паскоранага задавальнення кваліфікаванымі кадрамі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з мэтай павелічэння эфектыўнасці навучальна-выхаваўчага працэсу ў адпаведнасці з новымі рысамі сацыяльнага ладу, падрыхтоўкай умоў, неабходных для распаўсюджвання педагагічнай адукацыі на шырокія слаі насельніцтва.

Сярод спецыялістаў у галіне педагагічнай адукацыі існуе некалькі альтэрнатыўных меркаванняў наконт структуры дысцыплін педагагічнага цыкла і

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

паслядоўнасці іх выкладання ў межах цэласнай сістэмы псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў. Пры гэтым адсутнічае навуковае абгрунтаванне суадносін тэарэтычнай і практычнай частак падрыхтоўкі настаўнікаў, агульнай педагогікі і гісторыі педагогікі, класічнага і сучаснага педагагічнага вопыта, агульнатэарэтычнай і выканаўчай падрыхтоўкі.

На наш погляд, улічваючы пашырэнне ролі і функцыі педагагічнай адукацыі ў грамадстве, сістэма педагагічнай адукацыі можа быць прадстаўлена ў выглядзе графічнай мадэлі, складзенай з трох узаемапаралельных пласкасцей, працягласць якіх ускосна адлюстроўвае аб'ём змястоўнага складу педагагічнай адукацыі ў адносінах да розных катэгорый насельніцтва. Так, першая плоскасць лічыцца базавай і ахоплівае дзяцей, падлеткаў і юнакоў ад 15 да 18 гадоў; другая – дарослае насельніцтва ад 18 гадоў; трэцяя плоскасць адносіцца да тых, хто атрымлівае прафесійную педагагічную падрыхтоўку ў розных формах.

Адносная незалежнасць і самастойнасць трох відаў педагагічнай адукацыі не пазбаўляе іх узаемасувязі.

У межах прыведзенай мадэлі дадатковыя прынцыпы, выцякаючыя з іннавацыйных сацыяльных працэсаў, у спалучэнні з традыцыйнымі даюць магчымасць асэнсаваць змястоўны склад педагагічнай адукацыі і вызначыць стратэгію яе развіцця суадносна з аб'ектыўным ходам сацыяльных з'яў.

На сучасным этапе развіцця педагагічнай тэорыі і практыкі мэтазгодна лічыць неабходнымі кампанентамі зместа педагагічнай адукацыі ў трэцяй плоскасці наступныя: культурна-гістарычны; агульнапедагагічны; праектыровачна-тэхналагічны; дзеесна-выканаўчы; эколагавалеалагічны; арганізацыйна нарматыўны.

Агульнапедагагічны кампанент можа насіць характар сітэмнага і складацца з наступных тэарэтычных дысцыплін: асновы тэарэтычнай педагогікі, тэорыя развіцця асобы, дыдактыка, тэорыя выхавання, дыягностыка педагагічнага працэса.

Павелічэнне колькасці дысцыплін у складзе названага кампанента абумоўлена тым фактам, што за апошнія дзесяцігоддзі значныя дасягненні фундаментальнай педагагічнай навукі, а таксама і смежных навук, уваходзілі ў вучэбныя курсы вышэйшых навучальных устаноў, рыхтуючых настаўнікаў, толькі асобнымі момантамі, а гэта не спрыяла стварэнню тэндэнцыі абнаўлення педагагічных ведаў і абмяжоўвала ў нейкай меры развіццё педагагічнай адукацыі у цэлым.

Сказанае, безумоўна, не вычэрпвае ўсіх праблем падрыхтоўкі будучых настаўнікаў і арганізацыі педагагічнай адукацыі, аднак высвятляе некаторыя значныя ўмовы іх вырашэння.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова